**Тэма:** Спосабы ўтварэння слоў

**Мэта:** стварэнне ўмоў для знаёмства са спосабамі ўтварэння слоў (прыставачным, суфіксальным, прыставачна-суфіксальным).

**Задачы:**

- фарміраваць уменне утвараць новыя словы рознымі спосабамі, вызначаць спосаб ўтварэння слова, замацоўваць ўменні аб словаўтваральных паняццях, удасканальваць уменні выконваць марфемны разбор;

- развіваць арфаграфічную і пунктуацыйную пільнасць, уменне правільна лагічна выказваць свае думкі;

- спрыяць фарміраванню пачуцця калектывізму, узаемадапамогі, адказнасці, цікавасці да вывучэння моўных з'яў.

**Тып урока:** урок вывучэння новага матэрыялу з выкарыстаннем гульневай тэхналогіі і тэхналогіі блокавай падачы матэрыялу

**Форма ўрока:** урок-казка

**Абсталяванне:** "домікі Кораня, Суфікса і Прыстаўкі", надпіс "Краіна Словаўтварэння", малюнак хлопчыка Васі, карткі з моўнымі тэрмінамі і паняццямі, карткі з заданнямі, "Скарбонка ведаў", падручнік.

## Ход урока

### I. Арганізацыйны момант

- Дзень добры, дарагія сябры! Я ведаю, што сярод вас няма нікога, хто б не любіў родную мову. Я не памыляюся? Я рада, што вы з задавальненнем прыйшлі на ўрок, дзе …

Мова родная пануе,
Шмат чаго для вас рыхтуе,
Любоў, пяшчоту, ласку
І запрашае нас у казку.

Куды ж нас запрашае родная мова? *(У казку.)* Давайце адправімся!

### II. Паведамленне тэмы ўрока, пастаноўка задач.

Жыў-быў на свеце хлопчык Вася,*(вывешваецца малюнак хлопчыка на дошку)*
Вучыўся добра ён заўжды,
Ды толькі тэму, што на дошцы,
Раз прапусціў, бо хворы быў.
- А вы яе не прапусціце? Тады запішыце ў сшытак. *(Агучваецца тэма ўрока "Спосабы ўтварэння слоў", вучні запісваюць яе ў сшытак.)*

Ніяк не мог ён разабрацца
Ў тэрмінах і ледзь не ныў.
Змагаўся з імі ён змагаўся,
А потым сон яго змарыў
*(вучням прапануецца заплюшчыць вочы).*

І бачыць Васілёк у сне:
На месяц карабель нясе,
Яго так хутка, так імкліва,
Што ён, паверце, проста дзіва –
Трапляе ў іншую краіну,
Якой не знойдзеш на зямлі.
*(на дошца вывешваецца надпіс "Краіна Словаўтварэння", дзеці расплюшчваюць вочы)*

- Як называецца краіна, у якую трапіў наш падарожнік?
- Што вам пра яе вядома?
- Хто там можа жыць?
- Чым займаюцца яе жыхары?
- Як вы лічыце, што нас чакае ў гэтай краіне:
- з чым мы пазнаёмімся….;
- чаму навучымся…;
- чым карысныя будуць для нас веды, атрыманыя ад жыхароў гэтай краіны…?

Тады працягваем наша падарожжа.

**III Актуалізацыя ведаў.**

І бачыць Вася дзіўны дом.
І шыльдачкі на ім знаёмы.
*(на дошцы прымацаваны домік кораня, суфікса, прыставўкі)*

А ну, праверу, хто ёсць дома?
- Заходзьце, - кажа гаспадар
І кажа Вася: - Добры дзень!
Прыйшоў да вас я за парадай
І пазнаёміцца хачу,
Бо як назад я палячу,
Калі не ведаю ўсяго.
Хто тут жыве, і хто тут ёсць.
І кажа дзіўны чалавек:
- Я – Корань – галоўны з усіх.
У вучняў нашых ты спытай,
Яны адкажуць, хто такі.

- Што вам вядома пра корань?

- Чаму ён галоўны сярод усіх?

- Выберыце сярод тэрмінаў і паняццяў тыя, якія характарызуюць корань *(вучні выбіраюць карткі з характарыстыкамі кораня і кладуць іх у кішэню доміка Кораня)*:

*галоўная значымая частка роднасных і аднакаранёвых слоў;

*у гэтай марфеме заключаецца агульнае лексічнае значэнне роднасных слоў;

*каб вызначыць гэту марфему, трэба падабраць роднасныя словы.

І новы сябар Корань
Прапанаваў адразу Васільку
Згуляць з ім у гульню –
У жмуркі.

**Заданне ад Кораня** *(запісана на адваротным баку дошкі).*

Здагадайцеся, які корань прапушчаны ў словах, і назавіце яго.

с… аць,

пера… аць,

пры… ка

…ка

- Падбярыце яшчэ некалькі аднакаранёвых слоў з такіх коранем.

**IV-V. Знаемства з новым матэрыялам. Фарміраванне першасных уменняў і навыкаў.**

**1. Знаёмства з суфіксальным спосабам утварэння слоў.**

А вось і новы гаспадар.
*(паказвецца домік Суфікса)*
Знаёмы нечым яго твар.
Ён з Коранем заўжды сябруе
І пазнаёміцца з ім прапануе.
- Хто такі Суфікс?
- Падбярыце азначэнні да суфікса:
* значымая частка слова, якая стаіць пасля кораня і служыць для ўтварэння новых слоў.
* гэта марфема ўдакладняе, дапаўняе значэнне, заключанае ў корані слова;
* з дапамогай гэтай марфемы ўтвараюцца таксама і формы слоў.
- Чаму ён сябруе з Коранем?
- Як будзе называцца спосаб утварэння слоў пры дапамозе суфікса?

*Чытанне правіла ў падручніку.*

Вы, сябры, і мне ўвагу ўдзяліце,
Словы новыя ўтварыць дапамажыце.

**Заданне ад Суфікса.**

**Картка 1**

Утварыце словы пры дапамозе суфіксаў і ў кожнай групе слоў вызначце тое агульнае значэнне, што надае ім суфікс:
-нік: лес, кіраваць;
- чык: выкладаць, перапісваць;
- ік: брат, кот.
-н: мароз, голад.

**2. Фізкультхвілінка.**

**3. Знаёмства з прыставачным спосабам утварэння слоў.**

Пакінуў Вася гэты дом,
І нечакана за вуглом
Мільгнула яркая сукенка,
Што за дзівосная паненка?
- Я Прыстаўкаю завуся,
З Корнем у сябрах ваджуся.
Пра мяне раскажуць дзеці,
Якая роля мая ў свеце.

Пазнаёмце, калі ласка, Васілька з гэтай марфемай. Размяркуйце тэрміны ў домік Прыстаўкі.

*значымая частка слова, якая стаіць перад коранем і служыць для ўтварэння новых слоў;
* з дапамогай гэтай марфемы ўтвараюцца ўтвараюцца таксама формы слова.

Чаму Прыстаўка, як і суфікс, сябруе з коранем?
Як называецца спосаб утварэння слоў пры дапамозе прыстаўкі?

*Чытанне правіла ў падручніку.*

**Заданні ад Прыстаўкі.**

**Картка 2**

1. Утварыце прыставачным спосабам словы. Выкарыстоўваючы прыстаўкі пад-, уз, ад-, рас-, над-, раз-, аб-, з-, с-.

*Бегчы, біць, берагчы, несці, сыпаць, везці, трымаць, рэзаць, смяшыць, клеіць, важыць, маляваць.*

2. Утварыце ад слова *пісаць* як мага больш новых слоў з дапамогай прыставак

**4. Знаёмства з прыставачна-суфіксальным спосабам утварэння слоў.**

Суфіксу і прыстаўцы сумна па адным гуляць,
І вырашылі яны, ўдваіх да кораня ў госці завітаць.
- Як вы лічыце, што атрымаецца, калі Прыстаўка і Суфікс разам сходзяць у госці да Кораня?
Якім спосабам тады будуць утварацца словы?

*Чытанне правіла ў падручніку.*

Мы без працы не сядзім,
Словы новыя глядзім.
**Выкананне практ. 242** *(ўзаемаправерка выканання вучнямі з дапамогай настаўніка)*

**VI. Кантрольна-ацэначны этап.**

Тут наш Вася ідзе ўжо смела,
Хутка ён бярэцца за ўсё ўмела.
Ды нешта раптам зарыпела…
Што бачыць Вася?
Свой пакой… Свой стол і сшыткі,
Кнігі стосам…
І каб тут не застацца з носам,
Ён смела стаў рабіць заданні.
І вы таксама зробіце іх самі

Дарагія сябры, падарожжа наша завяршаецца. Але нас яшчэ адно выпрабаванне – тэст "Правер сябе", ён дапаможа зразумець, што вы ведаеце добра па новай тэме, і над чым патрэбна папрацаваць. Жадаю вам поспехаў!

Тэст "**Асноўныя спосабы ўтварэння слоў**"

1. Як называецца слова, якое ўтворана ад іншага слова ці ад яго асновы?
**а)** Вытворным
б) Утваральным

2. Вызначы ў кожным радзе і падкрэслі ў дужках тое слова, ад якога ўтворана асноўнае слова.
а) Леснічоўка (лес, ляснік, лесавы)
б) Пачырванець (чырвоны, чырвань, чырванець)
в) Садовы (сад, садзіць, саджанец)
г) Свавольнік (вольны, воля, сваволіць)
д) Ухваліць (хвала, хваліць, хвалёны)

3. Вызначы, якія словы ўтвораны прыставачным спосабам.
а) Гарадзішча
**б)** Непрыяцель
**в)** Паабапал

г) Падпіска
**д)** Разбалаваць

4. Якія словы ўтвораны прыставачна-суфіксальным спосабам?
**а)** Апенька
**б)** Безрукаўка
**в)** Зарэчны
г) Звышімклівы
д) Чытанне

5. Вызнач, ці ўсе словы ўтвораны адным і тым жа спосабам і падкрэслі “пятае лішняе”..
а) Адзенне
<u>б) Замаразак</u>
в) Красавік
г) Рыбак
д) Узорны

**VII. Падвядзенне вынікаў урока.**

**1.Гульня “Скарбонка ведаў”**

У нашай скарбонцы ляжаць пытанні да нашага ўрока. Я прапаную вам зараз на іх адказаць.

Вучні па чарзе выцягваюць пытанні і адказваюць на іх:

*Якімі спосабамі ўтвараюцца словы?
* Прывядзіце прыклад утварэння слоў прыставачным спосабам.
* Прывядзіце прыклад утварэння слоў суфіксальным спосабам.
* Прывядзіце прыклад утварэння слоў прыставачна-суфіксальным спосабам.
* На ўроку я даведаўся….
* На ўроку я навучыўся…

**2. Выстаўленне адзнак.**

**VIII. Дамашняе заданне.**

Вывучыць спосабы ўтварэння слоў, пр.238

**IX. Рэфлексія.**

Прышоў час нам развітацца з Васільком.
Якія парады б вы далі хлопчыку па тэме нашага ўрока? Што б пажадалі?
Жадаю, каб казка не канчалася,
Бяда і скруха на шляху не сустракаліся,
Вялізнага шчасця і верных сяброў,
Здароўя, поспехаў і сонечных дзён!